УДК 811.161.3-321

# Сінанімія ў тэрмінасістэме беларускай мовы

Савіцкая І.У.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Праблема сінаніміі ў беларускай навуковай тэрміналагічнай сістэме (ТС) з'яўляецца на сённяшні час надзвычай актуальнай. Традыцыйна гэтую моўную з'яву даследчыкі вызначаюць як недахоп ТС. Яны лічаць, што тэрмін – гэта асобая лексічная адзінка, а ТС – гэта асобы від знакавай сістэмы, які адрозніваецца ад сістэмы агульналітаратурнай мовы. Адсюль такая з'ява, як сінанімія, з'яўляецца шкоднай і тлумачыцца нераспрацаванасцю многіх ТС. Некаторыя вучоныя зусім адмаўляюць гэтую з'яву ў тэрміналогіі. Яны разглядаюць сінанімію як з'яву дублетнасці і падкрэсліваюць, што паміж дублетамі няма тых адносін, якія ўтварае сінанімічны рад, няма эмацыянальна-экспрэсіўных, стылістычных або звязаных з адценнем значэнняў.

Сапраўды, абазначэнне аднаго паняцця некалькімі тэрмінамі ўскладняе запамінанне, стварае пэўныя перашкоды пры ўзаемаразуменні спецыялістаў, а таксама пры перакладзе навуковых тэкстаў на замежныя мовы.

Аднак нельга не прымаць пад увагу той факт, што любая ТС – гэта сістэма, якая развіваецца, а не застылая, выкрышталізаваная. Тэрміны – гэта не проста пэўныя словы, а словы са спецыфічнай функцыяй. Ім уласцівы ўсе лексіка-семантычныя з'явы агульналітаратурнай мовы, бо, калі спецыяльная лексіка мовы навукі і тэхнікі з'яўляецца часткай усёй лексікі, яна павінна падпарадкоўвацца яе законам. Так, у навукова-тэхнічнай тэрміналогіі сінонімы суадносяцца з адным і тым жа паняццем і аб'ектам; яны не характарызуюць іх розных уласцівасцяў, не выконваюць стылістычных функцый, у адрозненне ад агульналітаратурнай мовы. У ТС рэалізуецца перш за ўсё семантычная разнавіднасць сінаніміі з функцыямі ўдакладнення і замяшчэння.

У беларускай мове спосабы ўтварэння сінонімаў разнастайныя і ў першую чаргу звязаны з узаемадзеяннем уласных слоў і запазычаных. Адсюль можна выдзеліць некалькі груп такога тыпу тэрмінаў-сінонімаў: сінонімамі з'яўляюцца запазычаныя словы (*буфер – бампер);* сінонімамі з'яўляюцца іншамоўны і ўласны тэрмін (*экспарт – вываз);* сінонімы – уласныя словы (*слізганне – слізгаценне – коўзанне);* сінонімы – поўная і кароткая формы тэрмінаў (*кінапраекцыйны апарат – кінапраектар).*

Як бачым, спосабы ўтварэння сінонімаў у беларускай навуковай тэрміналогіі цесна звязаны са спосабамі ўтварэння саміх тэрмінаў. Адсюль вынікае, што сінанімія характэрна найперш у перыяд актыўнай тэрмінатворчай дзейнасці на пачатковых этапах фарміравання самой ТС.